гісторыя

Альбіна Семянчук



...Стэрэатып нашага мысьленьня ў стасунку да Ф.Скарыны палягае на тым, што ён для нас у першую чаргу вялікі кнігадрукар і нам падаецца, што ўсё яго жыцьцё было падпарадкаванае адной мэце – выдаць Біблію для свайго народу і памерці знакамітым...

# Францішак Скарына ў Кракаве

*Беларуская культура вядзе свой пачатак не ад якога-небудзь сярэднявечнага манаха Скарыны, а ад Вялікай Кастрычніцкай рэвалюцыі...*

Вільгельм КНОРЫН.

У зімовы семестр 1504 г. пад час рэктарства Яна Аміцына ў альбом іматрыкуляцый Кракаўскага універсітэту ўпісаліся 122 асобы, у тым ліку некалькі шкаляроў, якія паходзілі з беларускіх земляў Вялікага Княства Літоўскага: Мікалай сын Андрэя з Ашмяны, Юры сын Якуба з Ваўкавыску, Венцаслаў сын Венцаслава са Слуцку, Мікалай сын Аляксея з Дзітвы, Францыск сын Лукі з Полацку[1]. Апошняму было наканавана праславіць у вяках ня толькі alma mater, але і ўвесь свой народ, для асьветы якога ён пераклаў і выдаў Біблію.

Як хлопец з далёкага усходняга памежжа Вялікага Княства Літоўскага мог патрапіць на штудыі ў сталіцу Польскага

*На здымку: адзін з кракаўскіх касьцёлаў.*

[1] Album studiosorum Universitatis Cracoviensis. Tomus II (Ab anno 1490 ad annum 1551). Editionem curavit Adam Chmiel. Cracoviae 1892. P.90-92.

Каралеўства? Адноўленая ў 1400 годзе каралём польскім і вялікім князем літоўскім Ягайлам і каралевай Ядзвігай, акадэмія ў Кракаве задумвалася як вышэйшая навучальная ўстанова для аб'яднаных Крэўскай уніяй 1385 г. Каралеўства Польскага і Вялікага Княства Літоўскага[2]. Запатрабаваньне на адукаваных асобаў у ВКЛ, як і ў Польшчы, з кожным годам расло. Сюды ўжо таксама даходзілі павевы грандыёзных зьменаў, выкліканых вялікімі геаграфічнымі адкрыцьцямі. Калі ў Заходняй Еўропе паўставалі славутыя гандлёвыя кампаніі, назапашваліся капіталы, пашыраўся попыт на сакратароў, натарыусаў, банкіраў, вучоных прыродазнаўцаў і гуманістаў, у Цэнтральна-Усходняй Еўропе адбываліся тыпалагічна тыя ж самыя працэсы толькі з некаторым спазьненьнем і мясцовай сьпецыфікай.

Так, прадстаўнікі сям'і Скарынаў з Полацку здаўна займаліся вырабам скураў, аб чым гаворыць іх прозьвішча. Але бацька нашага Францішка ўжо сам, відаць, не апрацоўваў скуры, а толькі прадаваў іх у розныя куткі Цэнтральнай Еўропы. Яго абозы са скурамі дасягалі Каралеўца, Познані, Рыгі, Кракава. Гэта быў ужо, уласна кажучы, гандлёвы дом пад шыльдай "Лука Скарына і сыны"[3]. Старэйшы Іван пасьля сьмерці бацькі пераняў ягоную справу, а пазьней выступаў як спонсар-фундатар малодшага брата, калі той заняўся новай і, трэба прызнаць, даволі рызыкоўнай з фінансавага пункту гледжаньня кнігавыдавецкай справай. Францішак, як малодшы, мог, напрыклад, абраць духоўную кар'еру, але новыя часы прапаноўвалі новыя выклікі. Асьвета і адукацыя з прерагатывы рэлігійных асобаў і арганізацый ператварылася ў прафесійны занятак сьвецкіх асобаў. Францішак Скарына, па задуме бацькі, павінен быў вывучыцца, каб мець свой уласны кавалак хлеба, альбо спрычыніцца да пашырэньня сямейнага бізнесу. З універсітэцкай адукацыяй ён мог уладкавацца ў гаспадарскай канцыляры, што давала шырокія магчымасьці асобам, займаючым пасаду сакратара. Часта яны ўваходзілі ў асяроддзе найвышэйшых дастойнікаў (у адрозьненьне ад ніжэйшых пісараў, занятых механічным перапісьваньнем тэкстаў). Гэтая пасада дазволіла зрабіць бліскучую кар'еру аднаму з першых прадстаўнікоў знакамітага у будучым роду Сапегаў, Івану. Ён, у сваю чаргу, аддаў дваіх сыноў, Пятра і Паўла, вучыцца ў Кракаўскі універсітэт. Да таго ж асобы нешляхецкага паходжаньня праз тытул доктара навук набывалі роўныя з шляхтай свабоды і прэрагатывы[4].

Безумоўна, не толькі меркантыльнымі разважаньнямі кіраваўся Лука Скарына, калі пасылаў малодшага сына па навуку да полацкіх бернардынаў. Відавочна, хлопец дэманстраваў непаспалітую кемлівасьць і розум. Полацк напрыканцы XV ст. быў другім пасьля Вільні горадам у ВКЛ. Большасьць яго насельніцтва была праваслаўнага веравызнаньня, аб чым сьведчаць каля 10 цэркваў, якія былі асяродкамі духоўнай, еўрапейска-візантыйскай па сваім зьместу, культуры[5]. У Сафійскім саборы Полацку існавала вельмі багатая бібліятэка рукапісных кніг. Аднак адукацыя, якую давалі праваслаўныя школы, відаць, саступала па сваім узроўні асьвеце, якую прынесьлі з сабой манахі-бернардыны, што заснавалі свой манастыр у Полацку ў 1498 г.[6] Польскі правінцыял ордэну Уладзіслаў з Гельнава быў вядомым паэтам, грамадскім і рэлігійным дзеячом, а першы гвардыян кляштару ў Полацку Лявон з Ланьцута, які выконваў свае абавязкі да 1512 г.[7], таксама меў прагрэсіўныя погляды, што да асьветы мясцовага насельніцтва.

Па-за эвангелізацыйнымі і асьветніцкімі планамі полацкія бернардыны маглі рэалізоўваць далекасяжныя планы каталіцкіх колаў Вялікага Княства Літоўскага.

[2] Morawski K. Historya Uniwersytetu Jagiellocskiego. Srednie wieki i Odrodzenie. T.1. Krakyw 1900. S.58-59.

[3] Францыск Скарына. Зборнік дакументаў і матэрыялаў. Мінск, 1988. С.45, 49, 50.

[4] Soitykowicz. O stanie Akademii Krakowskiej od zaioïenia jey w Roku 1347, aï do terazniejszego czasu krytki wykiad historyczny. Krakyw 1810. S.588.

[5] Тарасаў С.В. Полацк IX – XVIII стст. Гісторыя і тапаграфія. Мн., 1998. С.80-81.

[6] Тамсама. С.82.

[7] PSB.

Як пазней езуіты, бернардыны распачалі сваю душпастырскую дзейнасьць адразу на захадзе і на ўсходзе ВКЛ (у 1468 г. паўстае кляштар у Вільні[8], у 1494 г. – у Гродне[9]). У XV ст. у асяроддзі каталіцкіх сьвятароў адбываюцца бурлівыя спрэчкі аб рэбаптызацыі праваслаўнага насельніцтва. Бернардыны выказваліся станоўча супраць паўторнага хрышчэньня праваслаўных. За ўсходняй мяжой, у Вялікім княстве Маскоўскім, у 1500 г. князь Іван III абураўся, што ў ВКЛ праваслаўных "перахрышчываюць у рымскі закон". У часы вялікага князя Аляксандра Ягелончыка (1492-1506) адзначаюцца спробы пашырыць на тэрыторыі ВКЛ ідэі Фларэнтыйскай царкоўна-рэлігійнай уніі[10]. У сувязі з яго жаніцьбай з маскоўскай князёўнай Аленай спрэчкі аб перахрышчваньні узмацніліся. Гісторык ордэна бернардынаў Ян з Камарова (ён, дарэчы, у 1511-14 гг. быў гвардыянам кляштару ў Вільні) пісаў: "Паміж прэлатамі і дактарамі (касьцёлу), з аднаго боку, і нашымі братамі, з другога, дайшло да разважаньняў аб рэбаптызацыі грэкаў, абрад якіх захоўваюць русіны і аб дапушчэньні іх да сьвятых абрадаў у нашых лацінскіх касьцёлах. Сьвецкія прэлаты і дактары сьцьвярджалі, што грэкі пры пераходзе на наш абрад павінны быць нанова хрышчаныя (rebaptisari) і толькі тады могуць прыступаць да сакрамэнтаў у нашых касьцёлах, у той час як нашыя браты, а перад усім міністр правінцыі айцец Ян (Vitreatoris) прытрымліваліся супрацьлеглай думкі, што менавіта рэбаптызацыя тут непатрэбная, але дастаткова прызнаць адзіную галаву касьцёла, г.зн. папу рымскага, і абяцаць быць яму паслухмяным; хто гэтак зрабіў, таму можна без усялякай рэбаптызацыі... прыступаць да сакрамэнтаў у нашых касьцёлах і такі за сапраўднага каталіка павінен уважацца"[11]. Папа рымскі Аляксандр VI, пасьля кансультацыяў з Янам (Іванам) Сапегам і Эразмам Цёлкам, сваёй булай у жніўні 1501 г. выступіў супраць рэбаптызацыі. Сапегу нават было дазволена пабудаваць касьцёл, у якім адбываліся б праваслаўныя і каталіцкія літургіі[12]. Пакідаючы за рамкамі артыкулу складаныя рэлігійна-тэалагічныя пытаньні, трэба, аднак, зазначыць, што менавіта ў сферы гэтай праблематыкі належыць шукаць адказу аб канфесійнай прыналежнасьці Францішка Скарыны, яго сьветапоглядзе, і, ў рэшце рэшт, разгадку таямніцы ягонага імя.

Дакументальныя пацьверджаньні аб вучобе Ф.Скарыны ў полацкай бернардынскай школе адсутнічаюць, аднак, каб працягваць навучаньне ў Кракаўскім універсітэце хлопец павінен быў ведаць лаціну і элементарны трывіюм навук – дыялектыку, граматыку, рыторыку, – чаго не давала ніводная праваслаўная школа. Візантыйска-славянская культура, як адзначаў Е.Клачоўскі, не выпрацавала праграму навучаньня, адпаведную новым часам, застаўшыся на ўзроўні I тысячагоддзя н.э. Славянскі Усход абмінула рэвалюцыя XII-XIII ст., зьвязаная з фармаваннем вялікай дынамічнай схаластычнай культурай[13]. Але школы розных каталіцкіх ордэнаў напрацягу XV-XVI стст. выправілі гэты недахоп, і ў Вялікім Княстве Літоўскім пачала стварацца еўрапейская сістэма адукацыі, якая складалася з пачатковых парафіяльных школаў, сярэдніх кафедральных школ і калегій, а таксама (з 1579 г.) Віленскай акадэміі. Ф.Скарына, магчыма, пэўны час вучыўся ў школе пры кафедральным касьцёле ў Вільні, з якой былі добрыя стасункі ў полацкага гвардыяна. Тут ён мог атрымаць належную падрыхтоўку для паступлення ў школу вышэйшага ўзроўню. Так, увосень 1504 г. Францішак Скарына (хутчэй за ўсе з абозам скураў) прыехаў у Кракаў.

Уезд Францішка Скарыны ў Кракаў для беларускай культуры можна параўнаць

[8] Morawski K. Historya Uniwersytetu... T.II. S.67.

[9] Kuty D.J. Etapy budowy pobernardycskiego koњcioia w Grodnie (w:) Sztuka ziem wschodnich Rzeczypospolitej XVI – XVIII w. Lublin. 2000. S.393.

[10] Pietkiewicz K. Wielkie Ksiкstwo Litewskie pod rz№dami Aleksandra Jagiellonczyka. Poznac. 1995.

[11] Цытата з: Morawski K. Historya ... T.2. S.71.

[12] Pelesz J. Geschichte der Union der Ruthenische Kirche mit Rom von den altesten Zeiten bis auf die Gegenwart. Bd.1-2. Wurzburg-Wien 1878. S.484, 486.

[13] Kioczowski J. Miodsza Europa. Europa Srodkowo-Wschodnia w krкgu cywilizacji chrzeњcijacskiej њredniowiecza. Warszawa 2003. S.419.

з ўездам Ісуса Хрыста ў Ерусалім. Гэта ня проста метафара, гэта сімвал нашай культуры, у якой сустракаюцца ўсходняя і заходняя традыцыі. Скарына працаваў на стыку дзьвюх вялікіх культураў, адзначаў А.Навумаў[14]. Вырасшы ва ўсходняй традыцыі, у праваслаўі, як вучоны біблеіст, ён быў чалавекам Захаду. Кракаў, пазьней Падуя, Прага сфармавалі яго асобу, навучылі сьпецыфічнаму стаўленьню да традыцый не са сьляпой верай, а ў дынамічным разьвіцьці інтэлектуальнай спадчыны свайго народу. На працягу ўсяго XV стагоддзя насьпявалі перадумовы, каб гэтая сімвалічная сустрэча культур адбылася, каб сваёй прысутнасьцю ў старажытным еўрапейскім універсітэце беларус Францыск Скарына засьведчыў прысутнасьць усіх беларусаў у еўрапейскай культуры.

Скарына, безумоўна, ня быў першым беларусам, які набываў еўрапейскую адукацыю. Магістрам Кракаўскага універсітэту быў віленскі канонік (1508-1516) і вялікакняскі пісар (1492-1511) Адам Якубавіч з Котры (каля Гародні). У сваёй кнізе "Majus, De priscorum verborum proprietate" (Tarvisiae 1477) ён пакінуў дзьве глоссы: адну па лаціне – „Certe sum Ade Lithuani", другую аўтабіяграфічную па-руску – "Книга Адамова Якубовича с Котры, с Литвы з волости городенское, Зброшкова брата, емуж накладался на науку до Кракова болей десяти лет, из детинства ест при школе виленской ласкаве ховался, небошчик князь Ендрий, негды каноник и кустош костела виленского святого Станислава"[15]. Мы ведаем па імёнах некалькіх студэнтаў Кракаўскага[16] і іншых еўрапейскіх універсітэтаў выхадцаў з беларускіх земляў Вялікага Княства Літоўскага[17]. Усе яны, вобразна кажучы, рыхтавалі інтэлектуальную глебу для зьяўленьня на культурным небасхіле Усходняй Еўропы такой глабальнай постаці, як Францішак Скарына, дзякуючы якому беларуская культура магла ўжо не страшыцца дзесяцігоддзяў паланізацыі і русіфікацыі, існаваньня ў прыгнечаным стане на ўзроўні народнай, "мужыцкай" культуры. Нягледзячы на стагоддзі замоўчвання з боку польскамоўнай і паланафільскай культурнай эліты Рэчы Паспалітай, імя Францішка Скарыны зьяўляецца на сьцягу беларускага нацыянальнага адраджэньня ў XIX ст.

Калі далей сьледаваць логіцы сімвалаў і метафараў, то можна дадаць, што прыездам Ф.Скарыны ў Кракаў сканчваецца ананімна-маўклівы сярэднявечны перыяд нашай культуры і пачынаецца перыяд гуманістычна-рэнесансавага індывідуалізму. Да канца XV ст. у сферы культуры дзейнічалі пэўныя асобы, якія па розных прычынах захоўвалі свае інкогніта, аб іх дзейнасьці засталося вельмі мала, альбо зусім не засталося пісьмовых згадак, як, зрэшты, і іх твораў. Так, аб раньніх этапах жыцьця Ф.Скарыны на радзіме мы ня маем ніводнага дакладнага дакументу. Іншая сітуацыя пануе ў еўрапейска-гуманістычных асяроддзях Кракаўскага і Падуанскага універсітэтаў, дзе кожны студэнт мусіў напачатку іматрыкулявацца ў адмысловым альбоме (Album studiosorum), а пазьней фіксавалася кожная прыступачка іх навуковай кар'еры (Liber diligentiarum, Liber promotionum). Першыя праўдзівыя зьвесткі аб жыцьці Скарыны зьвязаныя з ягоным прыездам у Кракаў. У тым ліку адштурхоўваючыся ад іматрыкуляцыйнага запісу, вылічваецца дата нараджэньня Скарыны: студэнт паступаў у Кракаўскі ўніверсітэт звычайна ва ўзросьце 12-14 год, такім чынам, ён мог нарадзіцца каля 1490-га году.

Наступнай дакументаванай датай біяграфіі Ф.Скарыны зьяўляецца атрыманьне ім

[14] Naumow A. Wiara i historia. Z dziejyw literatury cerkiewnosiowiacskiej na ziemiach polsko-litewskich. S.95.

[15] W.Wisiocki, Incunabula typographicae Bibliothece Universitatis Jagiellonicae, Krakyw 1900, s.368.

[16] Януш Гурко dux Russiae, князь Андрэй Syetkonis de Russia, Аляксандр сын Аляксандра князь de Russia, прадстаўнікі сям'і Гедройцяў, Андрэй Свірскі, Януш Гаштольд, Петр і Павел Сапегі, князь Павел Гальшанскі (Morawski K. Historya... T.2. S.65-67)

[17] Zoi№du-Strzelczyk D. Peregrinatio acfdemicf. Studia miodzieÿy polskiej z Korony i Litwy na akademiach i uniwersytetach niemieckich ew XVI i pierwszej poiowie XVII wieku. Poznac 1996; Pietrzyk Z. W krkgu Strasburga. Z peregrynacji miodzieÿy z Rzeczypospolitej polsko-litewskiej w latach 1538-1621. Krakyw 1997; Chachaj M. Zagraniczna edukacja Radziwiiiyw. Lublin 1995.

14 сьнежня 1506 г. ступені бакалаўра вызволеных навук[18]. Разам з ім гэтую ступень атрымалі Тамаш з Падляшша, Павел з Марыенбургу, Андрэй і Конрад з Монта-Рэгіі (Каралеўца) і інш. Паміж дзьвюма датамі – восень 1504 – сьнежань 1506 г. – ляжыць перыяд напружанай інтэлектуальнай працы маладога чалавека, якую звычайна ўвенчвала ступень бакалаўра. Прыкладна толькі чвэрць студэнтаў універсітэту скончвала сваю вучобу з гэтай ганаровай ступеньню[19]. Пасьля чаго большасьць з іх магла распачынаць педагагічную працу ў кафедральных і парафіяльных школах.

Францішак Скарына вучыўся на пачатковым факультэце універсітэту – artium, альбо філасофскім. Акрамя гэтага ў Кракаве існавалі факультэты тэалогіі, права і медыцыны. Не знакамітыя італьянскія, а Парыжскі універсітэт паслужыў за ўзор і ідэал для арганізацыі Кракаўскага універсітэту ў часы караля Ягайлы[20]. У аснове яго ляжала сістэма бурсаў. У перыяд вучобы Ф.Скарыны іх было 10. Для ліцьвінаў і русінаў прызначалася найстарэйшая бурса “Pauperum”, заснаваная доктарам тэалогіі Янам Ісьнерам у 1409 г. (бурсе засталася, дарэчы, бібліятэка Ісьнера[21], з якой захаваліся 22 рукапісы ў Ягелонскай бібліятэцы). У 1461 г. “бацька польскай гісторыі” Ян Длугаш купіў яшчэ адзін дом і злучыў два будынкі для патрэбаў бурсы “Pauperum”[22]. Аднак выхадцы з Беларусі маглі жыць таксама і ў бурсе “Ерусалім”, права ўступу да якой меў кожны, не гледзячы на паходжаньне, стан і нацыянальнасьць. Сярэднявечныя універсітэты з мэтай падтрыманьня належнай дысцыпліны прымушалі моладзь жыць у бурсах альбо ў прызначаных універсітэтам дамах. У Кракаве ў 1491 г. быў прыняты статут, дзе дэкларавалася неабходнасьць жыць у бурсах і калегіях, “каб студэнты ад навук не былі адарваныя і не марнавалі бацькоўскага набытку”[23].

Ва ўсіх сярэднявечных еўрапейскіх універсітэтах асноўны націск у працэсе навучаньня рабіўся на вывучэньне твораў Арыстоцеля. У Кракаве актыўна выдаваліся яго працы на лацінскай мове (Phisica auditu. 1503; Meteorologica, Oeconomicorum libri duo. 1512; Politica. Rhetorica). Скарына мог чытаць ужо ў друкаваным выглядзе працы знакамітага філосафа XIII ст. Альберта Вялікага, якія выдавалі ў Кракаве К.Гохфедэр і Я.Галер (Albertus Magnus. De intellectu et intelligibili. 1504; Philosophia pauperum. 1508). Лацінскую граматыку Скарына хутчэй за ўсё вывучаў па славутым падручніку Э.Даната, вучонага IV ст. н.э., перапрацаванаму прафесарам кракаўскага універсітэта Янам з Глагова і выдадзенаму ім у Ляйпцыгу ў 1500 г., альбо па падручніках італьянскіх гуманістаў А.Датуса і М.Пероцьці.

Напачатку XVI ст., у перыяд знаходжаньня ў Кракаве Францішка Скарыны, замест Арыстоцеля студэнты пачалі вывучаць тэксты класічных аўтараў – Вергілія, Авідыя, Гарацыя, Тэрэнцыя, Ювеналія, Плаўта, Цыцерона і інш., а таксама трактаты італьянскіх гуманістаў Я.Баптысты з Мантуі, Ф.Філельфа, П.Лета, Л.Арэціна. У гэтым выразна выявіліся гуманістычныя тэндэнцыі сярод студэнтаў і выкладчыкаў Кракаўскага універсітэту. Яны па сутнасьці сваёй уяўлялі поўную супрацьлегласьць сярэднявечным ідэалам. Замест звышнатуральнага і аскетычнага погляду на сьвет гуманісты прапагандавалі натуральныя чалавечыя вартасьці, прагу да жыцьця, замест іерархічнай супольнасьці, адносна якой чалавечая адзінка была нічым, рабілі ідэалам свабодны індывідуалізм, замест дзіцячай веры, уводзілі дух крытыкі, замест песімізму, жыцьцесьцьвярджальны аптымізм і веру ў прагрэс[24].

---

[18] Францыск Скарына. Зборнік дакументаў і матэрыялаў. С.58.

[19] Morawski K. Historya… T.1. S.214. Як працякала жыццё студэнта Кракаўскага універсітэта можна меркаваць па стаўшых ужо класічнымі манаграфіях К.Мараўскага “Гісторыя Ягелонскага універсітэту. Сярэднія вякі і Адраджэнне” і Г.Барыча ”Гісторыя Ягелонскага універсітэту ў эпоху гуманізму”.

[20] Ibid. S.70.

[21] Polski Siownik Biograficzny. T.X. 1962.

[22] Morawski K. Historya... T.II. S.343.

[23] Ibid. S.354.

[24] Barycz H. Historja Uniwersytetu Jaliellocskiego w epoce humanizmu. Krakyw 1935. S.12

Еўрапейскім універсітэтам цяжка было адразу прыняць гуманізм, паколькі самі яны былі ўвасабленнем сярэднявечча, яго найдасканалейшым стварэннем. Тым не менш, усё больш маладых магістраў стараліся замест арыстоцелеўскай дыялектыкі ўводзіць у свае праграмы вывучэньне твораў класічнай літаратуры. Дарэчы, празмернае захапленьне імі прывяло да таго, што лаціна з вульгарнай сярэднявечнай, але жывой мовы навукі і культуры, ператварылася ў мёртвую мову[25].

Сярод першых кракаўскіх гуманістаў можна назваць Сільвіюса Аматуса, былога настаўніка рымскага права ў Венскім універсітэце. З ім Ф.Скарына сустракаўся у Вільні ў 20-я гады XVI ст.[26] Асабліва папулярным на пачатку XVI ст. быў прафесар Ян з Глагова – аўтар тэарэтычных трактатаў амаль па ўсіх курсах філасофскага факультэта, выдатны астраном, які з 1490 г. (пасля смерці Бернарда з Нісы) да 1492 г. па просьбе вялікага князя Казіміра Ягелончыка быў выхавацелем Яна Гаштольда[27]. Род Гаштольдаў у канцы XV – пачатку XVI стст. быў найбольш уплывовым у палітычным бамондзе Вільні, прадстаўнікі якога зрабілі эпахальныя крокі для ўсёй культуры ВКЛ – склалі новую рэдакцыю беларуска-літоўскага летапісання (другі летапісны звод) і кадыфікавалі права Вялікага Княства Літоўскага (Статут 1529 г.).

Іншымі старэйшымі сучасьнікамі Скарыны, якія маглі яго вучыць у Кракаўскім універсітэце, былі Міхал з Вроцлава – філолаг і матэматык, выкладчык антычнай літаратуры, Марцін Бэм з Олькуша – астраном і тэолаг. Славуты кракаўскі астраном Войцех з Брудзева, прыехаўшы ў Вільню, застаў там свайго калегу магістра Кракаўскага універсітэту Адама з Вільні, які быў сакратаром Аляксандра Ягелончыка. Віленскім біскупам стаў таксама выпускнік універсітэту магістр Войцэх Табар. Ян з Асьвенцыму – выдатны мысьляр і палітычны дзеяч, які ў Вільні на пачатку XVI ст. напісаў невялічкі трактат аб праваслаўнай веры “Elucidarius errorum ritus Ruthenici”. Скарына хутчэй за ўсё ведаў Яна з Стобніцы, знаўцу філасофіі Д.Скота, які выдаў трактат пад назвай “Parvulus philosophiae naturalis” (1507), дзе не шкадаваў пахвалы маладому Паўлу Гальшанскаму[28]. Усе гэтыя славутыя асобы разам з Францішкам Скарынам стваралі адзіную інтэлектуальную эліту Вялікага Княства Літоўскага і Каралеўства Польскага.

Кракаўскі перыяд жыцьця нашага першадрукара, безумоўна, быў часам станаўленьня яго характару і поглядаў. Чыньнікамі гэтага былі ня толькі універсітэт, але іншыя культурныя і інтэлектуальныя асяродкі. Тут Францішак Скарына непасрэдна дакрануўся да друкаваных кніг, у тым ліку кірылічных, выдадзеных Швайпальтам Фіёлем, ды пазнаёміўся з іншымі мясцовымі друкарамі. Кнігавыдавецкая дзейнасьць Ш.Фіёля была надта кароткай (2-5 год). Абвінавачаны ў сімпатыях да гусізму, ён апынуўся за кратамі. Прычына зьняволеньня была, напэўна, ня столькі ў гусіцкіх поглядах друкара, сколькі ў непрыхільным стаўленьні кракаўскага клеру да славянска-візантыйскіх традыцыяў, якім спрыяў сваёй друкарскай дзейнасьцю Фіёль[29]. Дарэчы, пазьней Скарыну таксама абвінавачвалі ў гусіцкіх ерасях[30].

Напэўна, Скарына ведаў і працы знакамітага друкара Яна Галера, які з 1503 да 1525 г. выдаў больш за 250 кніг, шмат з якіх мелі гербы дынастыі Ягелонаў – Арла і Пагоню. Адно з ягоных выданьняў было прысьвечанае праблеме разьмежаваньня граніц паміж Мазоўшам і ВКЛ[31]. У афіцыне Яна Галера выкладчык астраноміі кра-

---

[25] J.Delumeau. Cywilizacja Odrodzenia. Warszawa, 1993. S.317.

[26] Францыск Скарына і яго час. Энцыклапедычны даведнік. Мінск, 1988. С.490.

[27] PSB. T.X. 1962. S.Starowolski w Hekotontas сцвярджае, што Ян з Глагова перакладаў Псалтыр і Біблію на рускую мову

[28] Morawski K. Historya... T.II. S.85.

[29] Siemianczuk A. Siemianczuk H. Oblicza Wschodu w dziejopisarstwe polskim do kocca XVI w. w: Oblicze Wschodu. Poznan, 1998.

[30] Лабынцаў Ю. Скарынаўскі каляндар. Мн., 1990. С.103.

[31] Галенчанка Г.Я. Францыск Скарына – беларускі і ўсходнеславянскі першадрукар. Мінск, 1993. С.92.

каўскага універсітэту Ян з Глагова выдаў адну з першых у Еўропе кніг (1501), дзе давалася інфармацыя аб адкрыцці Амерыкі[32]. У друкарні Фларыяна Унглера выдаваліся падручнікі і дапаможнікі для студэнтаў. Такія польскія друкары, як Ян Галер, Еранім Віетар былі высокаадукаванымі людзьмі свайго часу, скончвалі у свой час Кракаўскі універсітэт. Яшчэ адзін абсальвэнт Кракаўскага універсітэту выбраў для сябе прафесію кнігавыдаўца – гэта чэх Мікулаш Бакалаўр (у 1506 г. выдаў чэшскі пераклад ліста Амерыга Веспучы Mundus novus[33]).

Польска-чэшскія культурныя сувязі асабліва квітнелі ў перыяд, калі прадстаўнікі дынастыі Ягелонаў займалі прастолы ў Кракаве, Вільні, Празе і Будапешце. На пытаньне: чаму Скарына выбраў для сваёй кнігавыдавецкай дзейнасьці сталіцу Чэшскага каралеўства? – некаторыя дасьледчыкі адказваюць: таму што Скарына мог быць у сьвіце польскага караля, які ў 1515 г. наведаў Прагу і Вену[34]. Гэта значыць, што, хутчэй за ўсё, знаходзячыся ў Кракаве, наш першадрукар здолеў патрапіць на каралеўскі двор і засмець там патрэбныя знаёмствы сярод польскіх і беларуска-літоўскіх вяльможаў. Далейшая праца Скарыны ў якасці лекара на двары віленскага біскупа Яна ў Вільні зьяўляецца ўскосным пацьверджаньнем гэтай думкі. Аналіз пражскіх і віленскіх выданьняў Скарыны з геральдычна-генеалагічнага пункту гледжаньня таксама наводзіць на меркаваньне, што прадстаўнікі выбітных родаў Польшчы і Літвы былі мецэнатамі і спонсарамі смелага прадпрымальніка ў друкарскай справе[35].

Сярод інтэлектуалаў Кракаўскага кола, відаць, належыць шукаць паплечнікаў Скарыны. Новыя гуманістычныя ідэі, з якімі першадрукар пазнаёміўся пад час вучобы, вызначылі яго заняткі і далейшы лёс. Дарэчы, пасьлядоўнікі Скарыны на ніве беларускага кнігадрукаваньня з радзівілаўскіх афіцынаў у Берасьці і Нясьвіжы – Цыпрыян Базылік, Мацей Кавячынскі, Ваўжынец Крышкоўскі, Сымон Будны – таксама свае прагрэсіўныя ідэі вынесьлі з кракаўскай вучэльні.

Пасьля заканчэньня Кракаўскага універсітэту Скарына на доўгіх шэсьць гадоў зьнікае з нашага поля зроку, каб раптам у лістападзе 1512 г. зьявіцца нечакана ў Падуанскім універсітэце. Якімі таямнічымі сьцежкамі лёс завёў Ф.Скарыну ў паўночную Італію таксама пакуль не вядома. Мы не падзяляем скептычнага пункту гледжаньня Алега Латышонка, што Падуанскі універсітэт у той час гандляваў дыпломамі, асабліва свайго медычнага факультэту. Захаваліся пратаколы паседжаньняў экзаменацыйных камісіяў, якія засьведчылі высокі ўзровень здольнасьцяў і ведаў нашага земляка, а таксама просьбу "дазволіць яму ў якасьці *дару і асобай міласьці* падвергнуцца з ласкі божай выпрабаваньням у галіне медыцыны"[36].

Пратаколы экзаменаў пралілі таксама некаторае сьвятло на яго сацыяльны статус. Напрыклад, сам пра сябе ён паведаміў, што быў secretarius regis Datiae. Гэта інфармацыя выклікала ў дасьледчыкаў дзьве гіпотэзы: альбо Скарына ў Капенгагене служыў сакратарам караля Даніі, альбо ў Трансільваніі (былая рымская правінцыя Дакія) быў сакратарам аднаго з мясцовых гаспадароў. І адна, і другая гіпотэзы маюць ня шмат аргументаў на сваю карысьць. Дацкі сьлед праявіўся ў тым, што ў Каралеўскай бібліятэцы ў Капенгагене ў 1971 г. айцец Аляксандр Надсан знайшоў экземпляр "Малой падарожнай кніжкі", надрукаванай Скарынам у Вільні ў 1522 г.[37] Праверыць гэты сьлед даволі проста, трэба толькі мець, скажам, ітыне-

---

[32] Tazbir J. Szlachta a konkwistadorzy. Opinia staropolska wobec podboju Ameryki przez Hiszpanik, [w:] Tazbir J. Sarmaci i swiat. Prace wybrane. T.3. Krakow 2001. S.10.

[33] Ibid.

[34] Мыльнікаў А.С. Яшчэ раз аб прычынах паездкі Скарыны ў Прагу// Спадчына Скарыны. Зборнік матэрыялаў першых Скарынаўскіх чытанняў (1986). – Мн., 1989. С.57.

[35] Шаланда А.І. Герольд-Litherland 2003. Гродна.

[36] Францыск Скарына. Зборнік дакументаў і матэрыялаў. – Мн., 1988. – С.64.

[37] Пяць Стагодзьдзяў Скарыніяны XVI – XX. Апрацаваў В.Тумаш. Ню-Ёрк. 1989. С.XII.

рарыюм дацкіх каралёў і сьпіс іхніх сакратароў. Падобныя дасьледаваньні адносна Жыгімонта Старога ўжо даўно зроблены. Думаю, у гэтым кірунку нас не чакаюць неспадзяванкі.

Значна цяжэй сказаць штосьці пэўнае адносна трансільванскай, альбо семіградскай версіі. Гэта тэрыторыя сучаснай Румыніі, дзе панавалі на той час розныя князі (мог ўжывацца тытул rex замест тытула dux). Знайсьці дакументальныя пацьверджаньні прысутнасці нашага земляка тут будзе значна цяжэй. Ускосным аргументам на карысьць трансільванскай гіпотэзы зьяўляецца высокі ўзровень кірылічнага кнігадрукавання ў Семіграддзі на пачатку XVI ст., што магло натхніць Скарыну на падобную дзейнасць, а, можа, нават даць яму пэўны вопыт.

Стэрэатып нашага мысьленьня ў стасунку да Ф.Скарыны палягае на тым, што ён для нас у першую чаргу вялікі кнігадрукар і нам падаецца, што ўсё яго жыцьцё было падпарадкаванае адной мэце – выдаць Біблію для свайго народу і памерці знакамітым. Аднак да кнігавыдавецкай справы ён ішоў яшчэ доўгіх пяць гадоў, і, здаецца, ўвосень 1512 г. яго жыцьцёвыя планы выглядалі зусім па-іншаму. Прынамсі, у Падую ён прыехаў, каб экстэрнам здаць экзамены на ступень доктара медыцыны. Застаецца загадкай, дзе ён мог абараніць неабходную для гэтага магістэрскую ступень. Для атрыманьня доктарскай ступені Скарына мусіў тры гады вучыцца і адзін год практыкавацца ў галіне медыцыны. Ці не магло гэта адбывацца ў знаемым з дзяцінства Кракаве?

Але вядома, што медычны факультэт у Кракаўскім універсітэце перажываў у гэты час ня самы лепшы перыяд свайго існавання. Ён быў самы малалікі. Паводле статуту 1433 г. студэнты мусілі тут вучыцца 5 год, удзельнічаць у двух дыспутах і здаць экзамен на бакалаўра. Ад бакалаўра патрабавалася практыка, а таксама працяг вучобы, публічныя выклады два разы на год, а калі бакалаўр хацеў абараніць ступень доктара, то мусіў прайсьці праз 4 дыспуты і за два гады паведаміць аб сваім жаданьні здаць найвышэйшы іспыт. Усе гэтыя абставіны вымагалі сур'ёзнай прафесійнай падрыхтоўкі. Вядома, што першы доктар медыцыны тут абараніў сваю ступень 28 лютага 1527 г.[38]

Падуанскі універсітэт даваў на той час самую грунтоўную падрыхтоўку ў галіне медыцыны, там дзейнічалі 13 медычных кафедраў. Аднак Скарына ў ім не вучыўся, гэта было занадта дорага для яго. Нават каб здаць іспыты экстэрнам ён напісаў просьбу, каб яго вызвалілі ад неабходнай платы[39]. Да гонару падуанскіх прафесараў трэба адзначыць, што яны ацанілі прагу да ведаў славянскага хлопца, які за тысячы кіламетраў прыехаў у італьянскую сьвятыню навукі. Яны некалькі разоў зьбіраліся на паседжаньні сьпецыяльна дзеля Скарыны, хаця... афіцыйна Падуанскі універсітэт быў на той час зачынены: у Паўночнай Італіі ішла вайна. Гэты прыклад цудоўна ілюструе тагачасную сітуацыю ня толькі ў Еўропе: вайна вайной, а культура, як і ўся духоўнасьць, разьвіваецца па сваіх законах, непадуладных тым, хто хацеў бы сваім дэструктыўным умяшальніцтвам спыніць прагрэсіўнае разьвіцьцё грамадства.

Экстэрнам здаць экзамены на атрыманьне вышэйшай адукацыі альбо ступені магістра ці доктара стала магчыма, калі еўрапейскія універсітэты перасталі спраўляцца з аграмадным наплывам жадаючых вучыцца, што зноў жа было зьвязана з рэвалюцыйнай эпохай, у якую жыў Францішак Скарына[40]. Гэта ўнікальная эпоха гуманізму, Рэнесансу, вялікіх геаграфічных адкрыцьцяў і рэлігійна-рэфармацыйных рухаў, безумоўна, спараджала запатрабаваньне на такіх геніяў як Скарына. У некаторых еўрапейскіх краінах (Італія, Францыя, Нямеччына) ужо адчувалася "перавытворчасьць" інтэлектуальных кадраў, якія, не знаходзячы сабе прымянень-

[38] Morawski K. Historya... T.II. S.388.
[39] Францыск Скарына. Зборнік дакументаў і матэрыялаў. С.63-64.
[40] J.Delumeau. Cywilizacja Odrodzenia. Warszawa, 1993. S.318-319.

ня на радзіме (часта з-за рэлігійных пераканaньняў), вымушаныя былі шукаць сабе прытулку пры дварах іншых каралёў і магнатаў. Так воляй лёсу былі закінутыя на задворкі еўрапейскай айкумены італьянцы Філіп Калімах (Філіпа Буанакорсі), Эней Сільвіа Пікаламіні (будучы папа рымскі Пій II), гішпанец Петр Ройзіюш і інш. У вір навукова-інтэлектуальнага жыцця Еўропы быў уцягнуты і Францішак Скарына.

На працягу 1517-1519 гг. Скарына знаходзіўся ў Празе, дзе выступіў у новым для сябе амплуа друкара. З невядомых прычынаў (можа, фінансавых, а, можа, з-за эпідэміі моравага паветра) ня скончыўшы працы, Скарына вымушаны быў на пачатку 1520 году пакінуць Прагу і вярнуцца на радзіму, у Вільню.

Ён прадстае перад намі ў сваіх творах адначасова пісьменьнікам, перакладчыкам са старажытных моваў, экзэгетам, філолагам-біблеістам[41] , уласна тыпографам, а таксама, ілюстратарам сваіх выданьняў. Скарына сам пісаў акафісты што ставіць яго ў шэраг арыгінальных славянскіх гімнографаў. Гэта наводзіць на думку, што ён быў грунтоўна падрыхтаваны для гэтай дзейнасьці. Напэўна, на падрыхтоўку пайшлі гады. Характэрна, што Скарына распачаў друкаваньне Старога Запавету з Псалтыры – кнігі, па якой дзеці вучыліся чытаць. “Біблія руская”, прызначаная для “люду паспалітага”, павінна была пашырыць асьвету сярод яго землякоў. Шмат разоў адзначалася дасьледчыкамі, што Скарына ў духу гуманістычных поглядаў вучыў людзей быць добрымі, любіць свой родны край, быць патрыетамі: “Люди, икгде зродилися, к тому месту великую ласку имають”. А другой кнігай пасьля Псалтыры, надрукаванай Скарынам у Празе, была кніга Іова. Відаць, лёс Іова, церпячага страшныя пакуты ня дзеля сваіх грахоў, а таму, што Гасподзь дасылае яму выпрабаваньні, была асабіста блізкая Скарыне.

За асьветніцкім, тэалагічным і мастацкім “фасадам” скарынавай Бібліі хаваецца шмат загадак, якія даўно спрабуюць разгадаць гісторыкі, філолагі, мастацтвазнаўцы. За кулісы творчасьці Скарыны спрабавалі зазірнуць з дапамогай Торы і Кабалы. Аналіз геральдычнай праграмы выданьняў Скарыны наводзіць на думку, што Скарына ведаў і шырока выкарыстоўваў у сваіх творах навуку аб гербах. Захапленьне містычнымі навукамі і тэорыямі, алхіміяй, астралогіяй і кабалістыкай было цалкам натуральным нават у асяроддзі ўніверсітэцкіх прафесараў. Успомнім славутага чараўніка XVI ст. пана Твардоўскага, які, магчыма, вучыўся ў Кракаўскай акадэміі і жыў у польскай сталіцы на Падгужу. Апынуўшыся ў Вільне, ён з дапамогай чароўнага люстэрка выклікаў здань памерлай Барбары для караля Жыгімонта Аўгуста. Аднак у Кракаве вакол іх дзейнасьці была створаная неспрыяльная атмасфера. Значна лепшыя варункі для паглыбленых заняткаў эзатэрычнымі навукамі былі ў чэшскай Празе. Не выключана, што менавіта гэтыя абставіны прывялі туды нашага Скарыну. Са “слаўным местам Пражскім” у Скарыны былі зьвязаныя самыя станоўчыя ўражаньні. Трэба ўлічваць і атмасферу талерантнасьці і свабоды, якія панавалі ў Празе, чаго шукаў, напэўна Скарына ўсё сваё жыцьцё.

Аднак будучы чалавекам эпохі Рэнесансу, ён заставаўся веруючым хрысьціянінам такім, як Саванарола, Піка дэла Мірандола ці Фічына.

У Кракаў, відаць, Скарына больш не вяртаўся. Магчыма, толькі па дарозе ў Прагу ў 1535 г., едучы па запрашэньні Фердынанда І працаваць каралеўскім батанікам на Градчанах, ён мог нядоўга затрымацца ў горадзе свайго юнацтва і маладосці, дзе ўсё пачыналася ў далёкім 1504 годзе...

[41] R.Juïny. Doktor Franciszek Skoryna z Ppoiocka (mikdzy 1485-1490 a 1552) oraz jego њredniowieczno-renesansowa biblistyka, [w:] Biblia w literaturze i folklorze narodyw wschodniosiowiacskich. Krakyw. S.87-99.